*к.ф.н., доцент С.Ф. Іванова, асп. А.Д. Цеплякова*
*(Магілёў, Беларусь)*

# ДА ТЫПАЛОГІІ ФУНКЦЫЙ КРЫЛАТЫХ СЛОЎ

У сучасным моваznaўстве пакуль не існуе аднастайнага падыходу да вызначэння функцый крылатых слоў як маўленчых адзінак.

Так, М.С. і М.Р. Ашукіны ў прадмове да трэцяга выдання свайго шырока вядомага даведніка "Крылатые слова" ([1955] 1987) вылучылі дзве функцыі крылатых слоў.

1. Вобразная функцыя, якая звязана з тым, што крылатыя словы з'яўляюцца "одним из средств образной и выразительной литературной речи" (Ашукин 1987: 4).

2. Намінацыйная функцыя, якая праяўляецца ў тым, што крылатыя словы "с удивительной меткостью выражают сущность довольно сложных явлений" (Ашукин 1987: 5).

В.П. Беркаў у прадмове да даведніка "Русско-норвежский словарь крылатых слов" (1980) вылучыў ужо чатыры функцыі крылатых слоў.

1. Абагульняльная функцыя, якая звязана з тым, што ў крылатых словах абагульняецца чалавечы вопыт, выражаецца жыццёвая мудрасць, адлюстроўваецца філасофскі сэнс. Гэтая функцыя, на думку даследчыка, з'яўляецца найбольш важнай, а большасць крылатых слоў такога роду паводле сваёй моўнай структуры з'яўляюцца закончанымі сказамі. Напр.: *Всё течет, всё изменяется*; *Человек человеку – волк* і да т. п. (Берков 1980: 12).

2. Намінацыйная функцыя, якая праяўляецца ў тым, што крылатыя словы выражаюць сутнасць якой-небудзь з'явы, характару, сітуацыі. Напр.: *А Васька слушает, да ест*; *делать из мухи* і да т. п. Паказальна, што крылатыя словы вельмі рэдка выкарыстоўваюцца ў функцыі намінацыі адзінкавых, унікальных рэалій. Напр.: *Северная Пальмира; Новый Свет* і да т. п. Такія крылатыя словы з пункту гледжання сваёй моўнай структуры могуць быць як закончанымі сказамі (*А ларчик просто открывался*), так і словазлучэннямі рознага тыпу (*зарыть свой талант в землю*), а таксама ўласнымі імёнамі (*Плюшкин, Личарда*) (Берков 1980: 13).

3. Вобразная функцыя, якая звязана з вобразнай формай крылатых слоў. Напр.: *Свежо предание, да верится с трудом*; *луч света в тёмном царстве* і да т. п. (Берков 1980: 13).

4. Эстэтычная функцыя, якая праяўляецца ў тым, што крылатыя словы запамінаюцца дзякуючы яскравасці і незвычайнасці сваёй формы, а асноўная функцыянальная значнасць паэтычных крылатых слоў палягае менавіта ў эстэтычнай плоскасці. Напр.: *Я помню чудное мгновенье*; *ночевала тучка золотая* і да т. п. (Берков 1980: 13).

Той жа В.П. Беркаў ва ўступным артыкуле "О крылатых словах" да даведніка "Большой словарь крылатых слов русского языка" (2000) чамусьці разглядае ўсе акрэсленыя ім у прадмове да даведніка "Русско-норвежский сло-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

варь крылатых слов" (1980) і прыведзеныя вышэй функцыі крылатых слоў (акрамя намінацыйнай) ужо як віды інфармацыі, што паведамляецца ў крылатых словах (Берков 2000: 11–12). У якасці ж уласна функцый крылатых слоў даследчык вылучае наступныя тры.

1. Аргументацыйная функцыя, якая звязана з ужываннем крылатых слоў у якасці аргумента нейкага прыватнага маркавання або фармулёўкі таго ці іншага агульнавядомага погляду. Напр.: _Правильно говорят:_ *новое – хорошо забытое старое*. (Берков 2000: 9).

2. Палемічная функцыя, якая праяўляецца ў "адштурхоўванні" ад зместу крылатых слоў, калі думка, якая ўіх адлюстроўваецца, ставіцца пад сумненне або аспрэчваецца. Напр.: *Всё ли бумага терпит; Лицом к лицу лица не увидать – неправда это, ещё как увидать!* (Берков 2000: 10).

3. Гумарыстычная функцыя, якая звязана з тым, што крылатыя словы шырока ўжываюцца для ажыўлення маўлення, пераводу яго ў жартаўлівую танальнасць. Напр.: *Александр Македонский герой, но зачем же стулья ломать?* або *Клопы умирали, но не сдавались* і да т. п. (Берков 2000: 10).

В.М. Макіенка і К.П. Сідарэнка ў прадмове да даведніка "Словарь крылатых выражений Пушкина" (1999) вылучаюць тры функцыі крылатых слоў.

1. Інтэртэкстуальная функцыя, што праяўляецца ва ўжыванні крылатых слоў у якасці інтэртэкстаў (Мокиенко 1999: 21).

2. Тэкстаўтваральная функцыя, якая звязана з выкарыстаннем розных асацыятыўных сувязей са зместам ці формай крылатых слоў пры пабудове тэксту. Напр.: *А ты, Вовка, хоть и не валил никогда декораций, но никогда не дойдёшь до поднятия сборов. Ты – **"почётный гражданин кулис"** (Евгений Онегин), и дальше **кулис** твой великий талант не передаётся... Зато утешься: тебя никто не будет **обшикивать.*** (Мокиенко 1999: 29).

3. Эмацыйная функцыя, якая праяўляецца ў адлюстраванні настрою таго, у чые вусны укладваюцца крылатыя словы. Напр.: [Маша:] – ***У Лукоморья дуб зелёный, златая цепь на дубе том... Златая цепь на дубе том*** (плаксиво). *Ну зачем я это говорю? Привязалась ко мне эта фраза с самого утра...* [Кулыгин (в смущении):] – *Ничего, пусть поплачет, пусть... Хорошая моя Маша, добрая моя Маша... Ты моя жена, и я счастлив, что бы там ни было... Я не жалуюсь, не делаю тебе ни одного упрёка... Вот и Оля свидетельница... Начнём жить опять по-старому, и я тебе ни одного слова, ни намёка...* [Маша (сдерживая рыдания):] – ***У Лукоморья дуб зелёный, златая цепь на дубе том... Златая цепь на дубе том...*** *Я с ума схожу...* ***У Лукоморья... Дуб зелёный...*** [Ольга:] – *Успокойся, Маша... Успокойся... Дай ей воды.* (Мокиенко 1999: 29–30).

С.Р. Шуляжкова ў дысертацыі "Крылатые выражения русского языка, их источники и развитие" (1995) і аднайменнай манаграфіі (2002) разглядае функцыі крылатых слоў, акрэсленыя В.П. Беркавым у прадмове да даведніка "Русско-норвежский словарь крылатых слов" (1980), і дадае да іх яшчэ восем функцый.

1. Ідэалагічная функцыя, якая праяўляецца ў выкарыстанні крылатых слоў для канцэнтраванага выражэння жыццёвай устаноўкі моўніка або той асобы, аб якой ідзе гаворка. Напр.: *Всё своё ношу с собой; Я знаю только то, что ничего не знаю* і да т. п. (Шулежкова 2002: 245).

2. Заклікальная функцыя, якая звязана з ужываннем крылатых слоў у



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

якасці лозунгаў, заклікаў. Напр.: *Кто был ничем, тот станет всем; Хлеба и зрелищ!* і да т. п. (Шулежкова 2002: 245–246).

3. Аргументацыйная функцыя, што праяўляецца ў выкарыстанні крылатых слоў у якасці пацвярджэння думкі моўніка або яго апеляцыі да агульнапрызнанага аўтарытэту. Напр.: *Нет, не позднюю любовь осуждаем мы. В конце концов* <u>*поэт прав*</u>*:* ***любви все возрасты покорны.*** *Реплика фельетониста.* (Шулежкова 2002: 246–247).

4. Характарызуючая функцыя, што звязана з ужываннем крылатых слоў як вербальнага сродка характарыстыкі ўнутранага стану, пачуццяў, знешнасці, дзеянняў, паводзін каго-небудзь. Напр.: *Эка невидаль, любила, рассталась.* ***Разошлись, как в море корабли***. (Шулежкова 2002: 247–248).

5. Кантактаўсталёўваючая функцыя, якая праяўляецца ў тым, што крылатыя словы ўжываюцца дзеля ўсталявання кантакту. Напр.: *Сёмка вошёл и окинул взглядом дырявые стенки. Его горбоносое, без щёк, лицо выразило, что он тронут. Но он сказал юмористически напыщенно: –* ***Привет тебе, приют священный***. (Шулежкова 2002: 248–249).

6. Гумарыстычная функцыя, якая звязана з ужываннем крылатых слоў у мэтах моўнай гульні, дзеля стварэння камічнага эфекту. Напр.: *У него было два ученика, губастые, весёлые. Парнишки – фэзеушники. Власов поучал их и говорил: – Чего тёркой, как* ***"Вдоль по Питерской..."****? Води тёркой так* ***"Ах вы, сени, мои сени!"*** *И показывал.* (Шулежкова 2002: 249–250).

7. Загаловачная функцыя, што праяўляецца ў надзвычай шырокім ужыванні крылатых слоў у якасці загалоўкаў розных тэкстаў. Напр.: *Это странное слово "внедрение"; Этот взрослый, взрослый, взрослый мир* і да т. п. (Шулежкова 2002: 250–252).

8. Кампазіцыйная функцыя, якая звязана з тым, што ў літаратурных тэкстах крылатыя словы выкарыстоўваюцца як элемент кампазіцыйнай будовы тэксту, імі завяршаюцца тэксты (або часткі тэкстаў), паглыбляючы і абагульняючы сказанае вышэй; пачынаюцца разважанні на нейкую тэму, называюцца тэксты, сігналізуючы пра тое, што далей паведамляецца; яны выконваць ролю творчага імпульсу да стварэння мастацкага твора малой формы, становяцца кампазіцыйнай асновай тэксту, блізкага па зместу да твора, які спарадзіў крылатыя словы і г. д. (Шулежкова 2002: 252–254).

Аналіз прапанаваных рознымі даследчыкамі функцый крылатых слоў ужываюцца ў маўленні, паказаў, што ў кожнай класіфікацыйнай схеме існуюць пэўныя лакуны, недакладнасці і ўнутраныя супярэчнасці. Розныя даследчыкі вылучаюць неаднолькавую колькасць функцый крылатых слоў, часта па-рознаму называюць і інтэрпрэтуюць адны і тыя ж функцыі.

Так, функцыі вобразная і намінацыйная вылучаюцца М.С. і М.Р. Ашукінымі і В.П. Беркавым, а функцыі гумарыстычная, аргументацыйная і абагульняльная – В.П. Беркавым і С.Р. Шуляжковай.

Тэкстаўтваральная функцыя згадваецца В.М. Макіенкам і К.П. Сідарэнкам, а таксама С.Р. Шуляжковай, якая называе яе кампазіцыйнай і размяжоўвае на некалькі падфункцый, сярод якіх імпліцытна вылучае абагульняльную ("в художественном тексте крылатая цитата может завершать абзац, углубляя и обобщая сказанное автором выше", гл. Шулежкова 2002: 252) і загаловачную ("включённое в заголовок крылатое выражение может свидетельствовать о каком-либо любопытном факте, крылатое выражение может иг-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рать роль творческого импульса к созданию художественного произведения малой формы, и тогда оно выносится в заглавие, становится зачином", гл. Шулежкова 2002: 253). Дарэчы, С.Р. Шуляжковай загаловачная функцыя крылатых слоў вылучаецца яшчэ і асобна.

Толькі В.П. Беркаў вылучае эстэтычную і палемічную функцыі, толькі В.М. Макіенка і К.П. Сідарэнка – інтэртэкстуальную і эмацыйную, толькі С.Р. Шуляжкова – ідэалагічную, заклікальную, характарызуючую і кантактаўсталёўваючую.

Такім чынам, відавочна, што **тыпалогія функцый крылатых слоў** патрабуе істотнага ўдакладнення.

Так, у залежнасці ад значнасці (істотнасці) і прадуктыўнасці ў маўленні функцыі крылатых слоў варта размежаваць на аблігаторныя і факультатыўныя.

**Аблігаторныя функцыі** уласцівыя ўсім без выключэння крылатым словам, рэгулярна праяўляюцца пры іх ужыванні ў маўленні. Да аблігаторных мэтазгодна аднесці дзве функцыі.

1. **Намінацыйная** функцыя, якая праяўляецца ў тым, што крылатыя словы выкарыстоўваюцца для абазначэння з'яў, сітуацый, тыпаў, адносін і да т. п.

2. **Інтэртэкстуальная** функцыя, якая звязана з выкарыстаннем крылатага слова ў тэксце як элемента іншага тэксту.

**Факультатыўныя функцыі** уласцівыя не ўсім крылатым словам, нерэгулярна праяўляюцца пры іх ужыванні ў маўленні. Да найбольш значных факультатыўных функцый адносяцца наступныя шэсць.

1. **Экспрэсіўная** функцыя, якая праяўляецца ў выкарыстанні крылатых слоў для эмацыйнай ацэнкі свету.

2. **Афарыстычная** функцыя, якая звязана з адлюстраваннем у крылатых словах у абагульненай форме значнай па зместу жыццёвай мудрасці, каштоўнага жыццёвага назірання.

3. **Аргументацыйная** функцыя, якая праяўляецца ва ўжыванні крылатых слоў у якасці аргумента той ці іншай думкі.

4. **Імператыўная** функцыя, якая звязана з ужываннем крылатых слоў у якасці лозунгаў ці заклікаў.

5. **Кумулятыўная** функцыя, якая праяўляецца ва ўжыванні крылатых слоў у якасці загалоўкаў.

6. **Гумарыстычная** функцыя, якая звязана з ужываннем крылатых слоў з мэтай стварэння камічнага эфекту.

Астатнія функцыі крылатых слоў не вызначаюцца прадуктыўнасцю і маюць індывідуальна-маўленчую прыроду.

*Ашукин, Н.С.* Предисловие к третьему изданию / Н.С. Ашукин, М.Г. Ашукина // Крылатые слова: Литературные цитаты. Образные выражения [1995]. – 4-е изд., доп. – М.: Художественная литература, 1987. – 528 с.

*Берков, В.П.* Русско-норвежский словарь крылатых слов / В.П. Берков. – М.: Русский язык, 1980. – 176 с.

*Берков, В.П.* Большой словарь крылатых слов русского языка / В.П. Берков, В.М. Мокиенко, С.Г. Шулежкова. – М.: Русские словари; Астрель; АСТ, 2000. – 624 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Мокиенко, В.М.* Словарь крылатых выражений Пушкина / В.М. Мокиенко, К.П. Сидоренко. – СПб.: Изд-во СПбГУ; Фолио-Пресс, 1999. – 752 с.

*Шулежкова, С.Г.* Крылатые выражения русского языка, их источники и развитие [1995] / С.Г. Шулежкова. – М.: Азбуковник, 2002. – 288 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова